# Творчая сустрэча ў Ваўкавыску

**У Ваўкавыску адбылося выступленне Дзмітрыя Радзівончыка. Падчас творчай сустрэчы ў бібліятэцы пісьменнік пагутарыў са старшакласнікамі адной з гарадскіх школ на тэму зацікаўленасці літаратурай і творчасцю ў цэлым, зрабіў прэзентацыі сваіх кніг, падарыў бібліятэкарам і школьнікам асобнікі зборніка крытычных эсэ «Навстречу попутному ветру». У мерапрыемстве прыняла ўдзел паэтэса Галіна Смок (Ваўкавыск).**

4 красавіка ў філіяле Гарадская бібліятэка № 46 горада Ваўкавыска для чытачоў і вучняў 10 “Б” класа СШ №7 адбылася творчая сустрэча з гродзенскім паэтам, літаратуразнаўцам, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрыем Мікалаевічам Радзівончыкам і мясцовай паэткай Галінай Іванаўнай Смок.

Паэт і літаратурны крытык пазнаёміў прысутных са сваёй творчасцю: кнігамі паэзіі «Пиррова техника» (2006); «Дым без огня» (2010); «Река безбрежная» (2015), зборнікам крытычных эсэ «Навстречу попутному ветру» (2018). Дзмітрый Мікалаевіч прадставіў рэцэнзію на творчасць Галіны Іванаўны Смок, вершы якой у выкананні аўтара гучалі падчас сустрэчы.

**Ваўкавыская** РЦБС

**На здымках:** падчас творчай сустрэчы з удзелам паэта, літаратурнага крытыка Дзмітрыя Радзівончыка (Гродна) і паэтэсы Галіны Смок (Ваўкавыск) у філіяле Гарадская бібліятэка № 46 горада Ваўкавыска. 4 красавіка 2019 года.




НАШ КРАЙ